# ВІЛЕНСКАЯ РЭДАКЦЫЯ ОПЕРЫ «ГАЛЬКА» СТАНІСЛАВА МАНЮШКІ

***Т. У. Ліхач,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,*
*Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі*

«Галька» – шэдэўр опернай творчасці С. Манюшкі, кульмінацыя віленскага перыяду яго дзейнасці. Гэты надзвычай яркі, эмацыянальны, насычаны трагізмам твор адзначаўся значнай ступенню арыгінальнасці і з немалымі цяжкасцямі праклаў сабе шлях на сцэну. Шырокавядомая, папулярная версія «Галькі» – гэта варшаўскі варыянт, перапрацаваны Манюшкам для пастаноўкі 1858 г., варыянт шмат у чым кампрамісны, у якім аўтар вымушаны быў саступіць перад устойлівымі канвенцыямі опернай сцэны сярэдзіны XIX ст.

«Галька» па многіх параметрах дрэнна ўпісвалася ў кантэкст музычных пастановак на сцэнах тэатраў Расійскай імперыі. Усеўладная расійская цэнзура пільна сачыла за зместам усіх п’ес, што даводзіла часам да амаль што абсурдных сітуацый. Зб. Енджыхоўскі апісвае, напрыклад, сапраўдны «данос цэнзуры на сябе саму» – рапарт 1841 г. «Аб прадстаўленні на сцэне трагедый і драм», пададзены на імя А. Бенкендорфа. У ім адзначалася, што з-за надзвычайнай пільнасці цэнзараў са сцэн, па сутнасці, знікаюць трагедыі і сур’ёзныя драмы, іх выцясняюць лёгкія камедыі. Аднак сітуацыя не змянілася, і ў рэшце рэшт «камедыя перамагла трагедыю» [4, с. 189]. Не дзіва, таму што большасць опер Манюшкі маюць у сваёй аснове менавіта камічныя, побытавыя сюжэты. Адзіным выключэннем да «Галькі» можна лічыць трохактавую оперу «Твардоўскі» на тэкст О. Мілеўскага, адзначаную ў рэестры п’ес антрэпрэнёра В. Шмідкофа за 1842 г. [4, с. 226–227][1].

Трагічны сюжэт «Галькі» быў вельмі блізкі Манюшку, адлюстроўваў важныя для яго сацыяльныя прыярытэты, спачуванне да абяздоленых і пакрыўджаных. Кампазітар актыўна ўдзельнічаў у стварэнні лібрэта оперы. Як вядома, у аснову яе пакладзена паэма У. Вольскага «Гальшка», забароненая цэнзурай, аднак шырокавядомая па рукапісных копіях. Паэма была вытрымана ў

[1] На жаль, твор не захаваўся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамантычным тоне і завяршалася крывавай драмай[2]. Якраз Манюшка прапанаваў карэнным чынам перапрацаваць сюжэт, наблізіўшы яго да штодзённых рэалій. У выніку атрымаўся надзвычай злабадзённы твор, які балюча ўдарыў па стэрэатыпных уяўленнях сучаснікаў Манюшкі. Яму ставілі ў віну тое, што гераіняй оперы была «паўшая» дзяўчына[3]; да таго ж, на думку шчырых абаронцаў «старасвецкай славы», Манюшка «ганебна расказвае пра продкаў», «зневажае іх слаўную памяць» [1, с. 136].

Спачуванне да сялян і пратэст супраць іх прыніжанага стану пасля «галіцыйскай разні» 1846 г.[4] успрымаліся шырокімі коламі шляхты як нешта «бессэнсоўнае… ці шкоднае», нават «нехрысціянскае» [1, с. 115]. Па словах былога сябра Манюшкі Ю. Сікорскага, кампазітар, абраўшы простанародныя сюжэты тыпу «Галькі», а потым «Фліса», «Ракічаны», «Парыі», тым самым паказаў, што «не разумее запатрабаванняў польскай публікі <...>; «ён абразіў памяць продкаў… кінуў абвінавачванні тым людзям, якія падчас “бунту” загінулі ад рук сялян» [1, с. 173].

Відавочныя «сялянскія» сімпатыі Манюшкі выклікалі занепакоенасць і царскіх улад. У 1850-х гг., паводле спісаў асоб, што знаходзіліся пад прамым ці тайным наглядам канцылярыі віленскага грамадзянскага губернатара, «пад тайны паліцэйскі нагляд трапіў творца “Галькі”, Станіслаў Манюшка» [2, с. 169]. Хутчэй за ўсё з-за гэтай агульнай апазіцыі як польскіх, так і расійскіх вышэйшых колаў наватарскаму, глыбока сацыяльнаму зместу оперы былі спынены і рэпетыцыі «Галькі» ў Варшаве (1847). Прэм’ера оперы (1848) адбылася сіламі пераважна аматараў у канцэртным варыянце ў салоне Мюлераў. Толькі праз шэсць гадоў, у 1854 г., «Галька» нарэшце прагучала на віленскай сцэне [3].

Цяжкі лёс оперы ў рэшце рэшт вымусіў кампазітара ў далейшым зноў выкарыстоўваць для сцэнічных твораў выключна «лёгкія», камічныя сюжэты. Напісаць яшчэ адну «сацыяльную трагедыю»

---

[2] Прывядзём кароткі пераказ сюжэта паэмы У. Вольскага. Багаты шляхціц Януш патаемна жэніцца на вясковай дзяўчыне Гальшцы і ідзе змагацца за вольнасць разам з легіёнамі Дамброўскага. У Гальшкі нараджаецца сын. Маці Януша абвінавачвае яе ў тым, што яна гвалтам ажаніла на сабе яе сына і загадвае прагнаць Гальшку з сынам галышом па сяле, збіваючы палкамі. Януш вяртаецца і бачыць магілы жонкі і сына. Ён забівае маці і сябе самога [1, с. 101].

[3] Прыблізна ў гэты ж час (1853) амаль аналагічныя папрокі гучалі і ў адрас творцы «Травіяты» Дж. Вердзі.

[4] На пачатку паўстання 1846 г. («кракаўскае паўстанне») у Галіцыі (на польскіх землях, што адышлі да Аўстра-Венгрыі) адбыліся сялянскія хваляванні, падчас якіх былі жорстка забіты шляхцічы і чыноўнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(опера «Парыя», задума якой адносіцца яшчэ да юнацкіх гадоў[5]) ён наважыўся толькі ў апошнія гады жыцця. Больш сур'ёзныя, канцэпцыйныя задумы (хоць зноў жа, ужо не востра сацыяльнага, а больш нейтральнага, гісторыка-міфалагічнага зместу) з канца 1840-х гг. ён пачынае рэалізоўваць у кантатным жанры. Па яго ўласных словах (1848), ён «пераканаўся, што такая форма кампазіцыі (кантата. – *Т.Л.*) зараз адзіная, якой трэба сябе прысвяціць. Яна дае ўсе ўмовы для драматычнай кампазіцыі, нават у больш свабодных формах, і, што самае важнае, дае магчымасць больш-менш прыстойнага выканання, наколькі кампазітар умее прыстасавацца да найубогіх мясцовых музычных сіл. Выкананне «Галькі» прывяло мяне да гэтай, сапраўды збавіцельнай думкі» [5, с. 185].

Калі ў 1857 г. нарэшце зноў з'явілася магчымасць паставіць «Гальку» ў Варшаве, Манюшка без усялякіх пярэчанняў зрабіў усё, што ад яго патрабавалі спевакі (на іх думку, «у оперы няма чаго спяваць»), балетмайстар («даць які-небудзь танцавальны эпізод: мазурку, аберэк, кракавяк»), рэжысёр («для кароткай оперы "Галька" занадта доўгая, а для цэлага спектаклю – занадта кароткая») [1, с. 147, 149–150]. У выніку двухактавая віленская рэдакцыя была перапрацавана ў чатырохактавую. Пры гэтым кожны з актаў быў падзелены на два і дапоўнены шматлікімі новымі нумарамі. У першы акт (у Варшаве адпаведна акты 1-ы і 2-і) былі ўведзены: песня Януша «Czemuż mnie w chwilach samotnych owych», сцэна Януша з хорам гасцей, арыя Стольніка, мазурка, рэчытатыў і арыя Галькі «Gdyby rannym słonkiem», дуэціна Януша і Ёнтэка; у другі акт (адпаведна акты 3-і і 4-ы): гуральскія танцы, думка Ёнтэка «Szumią jodły», дуэціна Галькі і Ёнтэка (усяго 8 разгорнутых нумароў). Усе гэтыя нумары – яркі прыклад «канцэрта ў касцюмах», яны відавочна спыняюць дзеянне, паслабляюць інтэнсіўнасць унутранай псіхалагічнай драмы галоўнай гераіні. Спектакль у цэлым стаў больш канвенцыянальным, відовішчным, больш падобным да іншых папулярных у той час опер.

На фоне варшаўскіх перапрацовак відавочнымі робяцца наватарскія рысы першапачатковага, віленскага варыянта «Галькі». Па словах В. Рудзінскага, у Вільні Манюшка «стварыў кампазіцыю, у якой музычная форма была непарыўна звязана са зместам», поўнасцю ім абумоўлена [1, с. 112]. Дзеля гэтага кампазітару прышлося адысці ад шмат якіх агульнапрынятых канвенцый опернай сцэны яго часоў. Так, відавочна перавага масавых сцэн

[5] Трагедыю К. Дэлавіня «Парыя» Манюшка пераклаў на польскую мову ў другой палове 1930-х гг., яшчэ ў Мінску, да ад'езду ў Берлін на вучобу [1, с. 14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(хары шляхты ў 1-м акце, народныя хары ў 2-м акце) над сольнымі, менавіта ў харах адлюстроўваўся галоўны канфлікт оперы – супрацьстаянне саслоўяў. У якасці асноўнай была абрана скразная драматургія, калі ўсе больш-менш завершаныя нумары з'яўляліся арганічнымі фрагментамі разгорнутых сцэн. Усе арыі і сольныя фрагменты перадавалі ўнутраны стан герояў, барацьбу эмоцый у іх душах. Пры гэтым выкарыстоўвалася шчырая, заснаваная на народных вытоках музычная мова, пазбаўленая знешняй віртуознасці і дэманстрацыі вакальных даных спевакоў.

Віленская «Галька» ў максімальнай ступені канцэнтравалася на вобразе галоўнай гераіні. Па сутнасці, гэта была псіхалагічная манадрама Галькі, бо толькі яна мела некалькі разгорнутых сольных эпізодаў (адзіную арыю – «I ty mu wierzysz, biedna dziewczyno» – меў таксама Ёнтэк[6]). Усе іншыя героі – Януш, Зоф'я – характарызаваліся ў ансамблях з Галькай ці на фоне масавых харавых сцэн.

Такім чынам, віленская рэдакцыя «Галькі» – самастойны, арыгінальны па музычнай драматургіі і вельмі цікавы твор, у якім Манюшка прадэманстраваў яркі талент да раскрыцця глыбокіх трагедыйных сюжэтаў. На жаль, на працягу ўсяго XIX ст. яго навацыі так і не былі патрэбным чынам ацэнены. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі на сцэнах пачынае з'яўляцца арыгінальны, вынашаны кампазітарам віленскі варыянт оперы.


1. *Рудзинский, В.* Монюшко / В. Рудзинский. – М. : Музгиз, 1960. – 284 с.

2. *Fornalczyk, F.* Hardy lirnik wioskowy: Studium o Kondratowiczu – Syrokomli / F. Fornalczyk. – Wyd. Poznańskie, 1972. – 525 s.

3. *Iwanicka-Nijakowska, A.* Stanisław Moniuszko, «Halka» / A. Iwanicka-Nijakowska. – URL: http://www.culture.pl/baza-muzyka-pelna-tresc//eo_ event_ asset_publisher/eAN5/content/stanislaw-moniuszko-halka.

4. *Jędoychowski, Zb.* Teatra grodzieńskie 1784–1864 / Zb. Jędoychowski. – Warszawa : Wydawnictwa Uniw. Warszawskiego, 2012. – 504 s.

5. *Rudziński, W.* Stanisław Moniuszko. Studia i materiały. – Kraków : PWM, 1955. – 477 s. – (Studia i materiały do dziejòw muzyki polskiej / pod red. T. Strumiłły. – T. I : Stanisław Moniuszko).


[6] Яго партыя пісалася ў віленскай рэдакцыі для сябра Манюшкі – італьянскага барытона А. Банольдзі [1, с. 116].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ